## Тэма 13. Рэвалюцыі канца 18 ст. у Галандыі і Бельгіі

1. Рэвалюцыя патрыётаў 1784–1787 гг. у Галандыі.
2. Брабанцкая рэвалюцыя 1789–1790 гг. у Паўднёвых Нідэрландах.
3. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў Нідэрландах і Бельгіі ва ўмовах французскага панавання.

### Літаратура

Шатохина-Мордвинцева, Г. А. История Нидерландов: учебное пособие / Г. А.  cortana. – М., 2007. – 515 с.

Намазова, А. С. Брабантская революция 1787–1790 гг. в Австрийских Нидерландах / А. С. Намазова. – Новая и новейшая история. – 2001. – № 6.

1. У пачатку 18 ст. Нідэрланды страцілі ролю вядучай прамысловай дзяржавы свету. У сярэдзіне 18 ст. назіраецца ўжо відавочны заняпад асноўных галін прамысловасці Рэспублікі: вытворчасць сукна, караблебудаванне, рыбалоўства. Прыйшоў да заняпаду і гандаль. Ва ўмовах эканамічнага спаду правячая алігархія пераарыентавалася на крэдытныя аперацыі, ператваралася ў рантье. Амстэрдам і Нідэрланды ў цэлым заставаліся важнейшым фінансавым цэнтрам Еўропы. Асноўнай крыніцай даходаў стала ўкладанне грошай у пазыкі замежным дзяржавам.

У палітычнай сістэме Нідэрландаў працягвалі спалучацца манархічныя і рэспубліканскія элементы кіравання. Гэта параджала палітычныя канфлікты ў Злучаных Правінцыях. У апошняй траціне 18 ст. назіраецца тэндэнцыя да збліжэння паміж гандлёва-фінансавай алігархіяй і аранжыстамі. У 1766 г. статхаўдэрства афіцыйна перайшло да Вільгельма V, але фактычна ўлада канцэнтравалася ў руках яго апекуна герцага Браўншвейгскага, які фактычна кіраваў краінай. Правячая партыя аранжыстаў праводзіла праанглійскую палітыку. Гэта выклікала незадавальненне сярэдняй і дробнай буржуазіі. Яна лічыла, што аранжысты разам з алігархіяй сваёй палітыкай не адстойваюць нацыянальныя інтарэсы, што іх палітыка перашкаджае эканамічнаму развіццю краіны.

Да пачатку 1780-х гг. адносіны паміж Нідэрландамі і Англіяй пагоршыліся. Нідэрланды прызналі ЗША, далучыліся да Лігі ўзброенага нейтралітэту. У адказ Англія абвясціла вайну Нідэрландам 31 снежня 1780 г. (Чацвёртая англа-галандская вайны). Вайна была няўдалай да Злучаных Правінцый. Блакада англійскага флота падарвала гандаль, англічане захапілі шэраг нідэрландскіх калоній. Велізарныя страты панесла Ост-Індская кампанія. Пагаршэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва прывяло да актывізацыі палітычных вытупленняў. У іх удзельнічалі гарадское насельніцтва, сялянства, незадаволеныя высокімі падаткамі. З’яўляецца вялікая колькасць памфлетаў, зваротаў да ўлад. Рэзкай крытыцы падвяргаўся статхаўдэр за паражэнні ў вайне з Англіяй. Незадавальненне выклікала карупцыя чыноўнікаў, предача дзяржаўных пасад па спадчыне ў вузкім коле алігархіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У склаўшайся сітуацыі ў правінцыі Утрэхт прадстаўнікамі буржуазіі была сфарміравана партыя, члены якой пачалі называць сябе патрыётамі. Партыя патрыётаў аб'ядноўвала прамысловую буржуазію, частку дваранства, рэгенства, тых, хто быў не задаволены палітыкай статхаўдэра. Ідэалогія патрыётаў фарміравалася пад ўздзеяннем французскага і англійскага Асветніцтва. Яны выступалі за дэмакратызацыю сістэмы кіравання Рэспублікай: абмежаванне ўлады статхаўдэра, каб да кіравання дзяржавай дапускаліся не толькі рэгенты, але і іншыя грамадзянне, стварэнне сістэмы кантролю над дзяржаўнай улады. Патрыёты лічылі неабходным забеспячэнне свабоды выступленняў і друку. Ад улад яны патрабавалі стымуляваць нацыянальную эканоміку. У прыватнасці, яны дабіваліся рэформы Ост-Індскай кампаніі: адмены яе манапольных праў і прызначэння кіраўніцтва Генеральнымі штатамі. У знешняй палітыцы патрыёты выступалі за саюз з Францыяй супраць Англіі.

Сваю першую палітычную праграму партыя патрыётаў выклала ў маніфесце "Да народу Нідэрландаў". Гэта быў зварот да нацыі, аўтарам якога з'яўляўся Іаан Дзірк ван дэр Капелен тот дэн Пол. Падставай для абнародавання маніфеста сталі фактычна здрадніцкія паводзіны статхаўдэра Вільгельма V у бітве пры Дагер-Банцы ў Паўночным моры 5 жніўня 1781 г. Нідэрландскі флот атрымаў перамогу, а статхаўдэр выказаў шкадаванне з гэтай нагоды. Такая дэманстрацыя праанглійскай пазіцыі выклікала выбух незадавальнення ў Нідэрландах.

27 верасня маніфест "Да народу Нідэрландаў" быў распаўсюджаны ў гарадах. Ён абвяшчаў суверэнітэт народа, а ў адрас статхаўдэра высоўвалася абвінавачванне ў узурпацыі праў народа. Маніфест абвяшчаў праграму дзеянняў, мэта якой заключалася ў тым, каб аднавіць ранейшую магутнасць Нідэрландаў. Намячалася правесці расследаванне прычын нездавальняючай арганізацыі абароны краіны, стварыць Савет для кантролю за дзейнасцю статхаўдэра. Гэты ж Савет павінен быў распрацаваць план па выратаванні краіны і пачаць яго рэалізацыю. Намячалася стварэнне народнай міліцыі і ўвядзенне свабоды друку. Гэта была праграма ліквідацыі ўлады фінансавай і гандлёвай алігархіі і адкрыцця шляху да ўлады сярэдняй і дробнай буржуазіі. Улады забаранілі маніфест, але ён працягваў распаўсюджвацца.

Восенню 1781 г. партыя патрыётаў перайшла да рэвалюцыйных дзеянняў. Сталі фарміравацца атрады міліцыі з грамадзян. У правінцыях ствараліся саветы ўпаўнаважаных. Яны бралі пад кантроль дзейнасць магістратаў і правінцыйных штатаў. Партыю патрыётаў падтрымалі бюргеры, сялянства, каталіцкія святары. Рух патрыётаў актывізуецца пасля падпісання мірнага дагавора з Англіяй у 1784 г. Асабліва значным уплыў патрыётаў быў у заходніх правінцыях. Тут нават частка рэгентаў падтрымала іх рэвалюцыйныя дзеянні. У чэрвені 1784 г. памёр лідар патрыётаў ван дэр Капелен. Але гэта не аслабіла дэмакратычны рух. У чэрвені 1785 г. на з'ездзе ўпаўнаважаных атрадаў народнай міліцыі быў абнародаваны дакумент пад назвай "Абавязацельства". Ён абвяшчаў галоўнай мэтай патрыётаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

усталяванне ў Рэспубліцы ўлады народнага прадстаўнічага схода, якому павінен падначальвацца і статхаўдэр.

Палітычным цэнтрам рэвалюцыйных падзей стала правінцыя Утрэхт. У гэтай правінцыі ўлада статхаўдэра была асабліва моцной, бо тут адсутнічала магутная гандлёвая буржуазія і ўплывовае дваранства. Важнейшым прапагандысцкім органам рэвалюцыйных сіл у Утрэхце стала газета "Весці з Нідэр-Рэйна". Яна крытыкавала палітыку статхаўдэра, змяшчала матэрыялы аб судовых справах па карупцыі ў адносінах да акружэння статхаўдэра. Калі ўлады забаранялі газету, яна распаўсюджвалася падпольна. У Утрэхце знаходзіўся цэнтр грамадзянскай міліцыі, які аб'ядноўваў г. з. свабодныя карпусы, што фарміраваліся насельніцтвам у гарадах і вёсках.

У шэрагу правінцый разгарнулася барацьба за ўладу. У Галандыі, Фрысландыі, Утрэхце статхаўдэра пазбавілі права прызначаць магістраў. Статхаўдэр быў пазбаўлены права камандаваць гарнізонам у сталіцы Гаазе. Гарнізон перайшоў у падпарадкаванне грамадзянскай міліцыі. Пасля гэтага Галандыя і Утрэхт пазбавілі Вільгельма V звання спадчынага статхаўдэра і адмірала флота Рэспублікі. Герцаг Браўншвейгскі, бліжэйшы дарадца статхаўдэра, быў выгнаны з краіны. Кіраўніцтва арміяй было перададзена камісіі з 5 дэпутатаў.

У правінцыйных штатаў адбыўся раскол. Большасць рэгентаў не падзялялі імкненне партыі патрыётаў да радыкальных пераўтварэнняў і не хацелі саступаць ім уладу. Нават у Амстэрдаме і Утрэхце рэгенты сталі схіляцца да кампрамісу з Вільгельмам V. Гэта аслабляла пазіцыі патрыётаў у гарадах і мяняла суадносіны сіл на карысць статхаўдэра. Аранжысты пачалі наступленне з аднаўлення сваіх пазіцый у паўночных правінцыях. Да лета 1786 г. яны падначалілі поўнач краіны. Туды з Гаагі перабраўся Вільгельма V. Значную дапамогу аранжыстам аказвала Англія. Аплатом патрыётаў сталі Галандыя, Утрэхт, Оверэйсселе, Гронінген.

У 1787 г. пачынаюцца першыя ўзброеныя сутычкі паміж патрыётамі і аранжыстамі. Да гэтага часу рэвалюцыя развівалася мірным шляхам. У чэрвені 1787 г. адбыўся інцыдэнт, які стаў зачэпкай для пачатку інтэрвенцi Прусіі ў Нідэрланды. Жонка статхаўдэра Вільгельміна, народжаная пруская прынцэса, паспрабавала вярнуцца ў Гаагу каб аднавіць там уладу аранжыстаў. Але была затрымана атрадам грамадзянскай міліцыі. Прускі кароль Фрыдрых Вільгельм II абнародаваў ультыматум да патрыётаў. Але яны не саступілі, бо разлічвалі на падтрымку Францыі. Гэтыя спадзяванні не спраўдзіліся. 13 верасня 1787 г. 26-тысячная пруская армія ўступіла на тэрыторыю Злучаных Правінцый. Рэгулярная армія Нідэрландаў перайшла на бок інтэрвентаў. Грамадзянская міліцыя не магла супрацьстаяць прусакам. 16 верасня яны занялі Утрэхт, 20 верасня – Гаагу, 10 кастрычніка паў апошні аплот патрыётаў Амстэрдам. Вільгельм V аднавіў сваю ўладу. Быў выдадзены "Гарантыйны акт", які вызначыў ролю і месца статхаўдэра як неад'емнага элемента канстытуцыйнай сістэмы Нідэрландаў. Патрыёты падверглiся праследу. Тысячы з іх пакінулі краіну.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Нідэрландская гістарыяграфія характарызуе апісаныя падзеі як Батаўскую рэвалюцыю, рух патрыётаў. Вызначае іх храналагічныя рамкі 1784–1787 гг. Па сваёй сутнасці гэтыя падзеі былі незавершанай буржуазнай рэвалюцыяй. Яна была накіравана супраць панавання гандлёвай і фінансавай алігархіі, што стала тады важнейшай перашкодай для далейшага развіцця краіны. Галоўная прычына паражэння рэвалюцыі заключалася ў прусскай інтэрвенцыі.

2. У выніку вайны з іспанскую спадчыну Паўднёвыя Нідэрланды перайшлі пад уладу Аўстрыйскіх Габсбургаў. Яны кіраваліся намеснікамі і мелі шырокую аўтаномію. Прычым кожная з 10 правінцый, на якія былі падзелены Аўстрыйскія Нідэрланды, захавала значную самастойнасць: свае органы ўлады, мытную сістэму, заканадаўства. Цэнтральным органам мясцовага кіравання заставаліся штаты правінцый. Без іх згоды ні адзін указ намесніка не ўступаў у сілу, толькі штаты ўводзілі падаткі. Штаты збіраліся 2 разы на год, а паміж іх пасяджэннямі засядалі выбарныя камісіі. Старынныя хартыі і дагаворы гарантавалі не толькі правы правінцый, але і асабістыя і палітычныя правы грамадзян. У час, калі трон Аўстрыйскіх Габсбургаў належаў Марыі-Тэрэзіі, а намеснікам быў Карл Латарынгскі, Паўднёвыя Нідэрланды дасягнулі найбольшага працвітання. Гэта датычылася не толькі прамысловасці, гандлю, але і адукацыі, і культуры.

У 1780 г. імперыяй Габсбургаў стаў аднаасобна правіць Іосіф II. Мэту сваёй палітыкі ён бачыў у тым, каб ператварыць уладанні Габсбургаў у адзіную цэнтралізаваную дзяржаву. Іосіф II пачынае рэформы без уліку мясцовай спецыфікі. Ён распаўсюдзіў на Паўднёвыя Нідэрланды тыя рэформы, якія праводзіў у сваіх спадчыных уладаннях. Указамі 1 студзеня і 12 сакавіка 1787 г. быў нанесены ўдар па самакіраванню правінцый. Штаты маглі па-ранейшаму збірацца, але толькі для таго, каб заслухаць прапановы ўрада і пагадзіцца з імі. Усе кампетэнцыі, якія раней належалі выбарным камісіям штатаў, былі перададзены чыноўнікам. Камісіі штатаў засталіся, але выбары іх членаў зацвярджаліся ўрадам, і яны мелі толькі дарадчыя функцыі. Быў усталяваны дзяржаўны кантроль над царквой.

У адказ на рэформы Іосіфа II, якія разбуралі традыцыйную сістэму кіравання, у Паўднёвых Нідэрландах пачаўся апазіцыйны рух. Яго ідэалагічнай асновай стала Асветніцтва. У Бельгіі былі вядомыя ідэі Русо, Вальтэра, Мантэск'е, Лока. Ідэі Асветніцтва шырока прапагандаваліся ў памфлетнай літаратуры. Выступленні апазіцыі, якія пачаліся ў Бельгіі ў адказ на рэформы Іосіфа II ужо ў 1787 г., гісторыкі называюць "малой" Брабанцкай рэвалюцыяй. Наступны, больш магутны ўздым апазіцыйнага руху ў Аўстрыйскіх Нідэрландах адбыўся пад уздзеяннем Французскай рэвалюцыі 1789 г. Фактычна ў краіне пачалося паўстанне.

Штаты Брабанта першымі перайшлі ў апазіцыю і заявілі, што не будуць ваціраваць падаткі, пакуль цалкам не будуць адноўлены ранейшыя правы. Да іх пачалі далучацца рамесніцкія карпарацыі. Апазіцыйны рух склалі розныя пласты бельгійскага грамадства: буржуазія, дваранства, рабочыя, рамеснікі, духавенства. Апазіцыя стварыла партыю праціўнікаў рэформ, ці партыю

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

патрыётаў на чале з Анры ван дэр Ноотам. Патрыёты абвясцілі Іосіфа ІІ тыранам, з якім трэба весці ўзброеную барацьбу.

Іосіф ІІ ад саступак адмовіўся і настойваў на выкананні яго ўказаў 1787 г. Дэлегацыя бельгійцаў, якая ездзіла ў Вену на перагаворы, вярнулася ні з чым. У Аўстрыйскія Нідэрланды быў накіраваны генерал Альтон з задачай самымі жорсткімі метадамі падавіць мяцеж. Ён правёў арышты дэпутатаў брабанцкіх штатаў, прадстаўнікоў духавенства, закрыў епіскапскія семінарыі ў Мельхене і Антверпене. Былі адменены канстытуцыйныя правы і свабоды бельгійцаў.

У такой сітуацыі ван дэр Ноот і яго прыхільнікі вымушаны былі эмігрыраваць у Галандыю. Тут фарміраваліся рэвалюцыйныя атрады з эмігрантаў. У Брэдзе ван дэр Ноот стварыў рэвалюцыйны камітэт. Ён разлічваў на дапамогу Галандыі. Прапаноўваў далучыць да яе бельгіскія правінцыі і стварыць адзіную рэспубліку. У саміх Аўстрыйскіх Нідэрландах Жан Франсуа Вонк рыхтаваў узброенае паўстанне. Ён стварыў тайную арганізацыю "За свае алтары і ачагі", дзейнасць якой распаўсюдзілася на ўсю Бельгію. Вонку ўдалося сфарміраваць паўстанскія палкі ў Льежы і Хеселце. Пад ціскам аўстрыйскі войск яны перайшлі граніцы Галандыі і далучыліся да рэвалюцыйнага камітэта ван дэр Ноота.

У канцы кастрычніка 1789 г. яны ўступілі на тэрыторыю Бельгіі. Да гэтых атрадаў сталі актыўна далучацца сяляне. На чале паўстанцаў быў Анры ван дэр Ноот. Паўстанцам удалося заняць шэраг гарадоў, у тым ліку такія буйныя, як Гент, Бруге. Ва ўмовах рэвалюцыйнага руху ўрад вымушаны быў пайсці на саступкі. Намеснік указамі ад 20 і 21 лістапада 1789 г. аднавіў сістэму кіравання, якая існавала ў Аўстрыйскіх Нідэрландах да 1787 г. Але гэта не спыніла рэвалюцыю. 10 снежня пачалося паўстанне ў Бруселі. Аўстрыйскія войскі адступілі з горада.

Да канца снежня 1789 г. аўстрыйскія войскі былі выцеснены амаль з усёй Бельгіі, за выключэннем Антверпена і Люксембурга (гарнізон Антверпена капітуліруе 29 сакавіка 1790 г.). 18 снежня рэвалюцыйны камітэт авясціў аб нізлажэнні Іосіфа ІІ. У студзені 1790 г. у Бруселі быў скліканы Нацыянальны кангрэс прадстаўнікоў усёй краіны. Яго задача заключалася ў распрацоўцы канстытуцыі. 11 студзеня 1790 г. Нацыянальны кангрэс абвясціў краіну рэспублікай пад назвай Бельгійскія Злучаныя Штаты.

У гэты час пачынаецца барацьба ўнутры рэвалюцыйнага лагера. Ён распаўся на дзве партыі. Адну склалі кансерватары на чале з ван дэр Ноотам. Яна аб'яднала клерыкальныя колы, дваранства. Яны патрабавалі вяртання да старой дзяржаўнай сістэмы, калі правінцыі прадстаўлялі сабой практычна самастойныя дзяржаўныя ўтварэнні. У агульнабельгійскім маштабе Генеральныя штаты павінны былі замяніць як вышэйшы орган улады Іосіфа ІІ. Другая партыя, прыхільнікі Вонка, лічыла, што ў краіне павінны быць праведзены шырокія дэмакратычныя рэформы, каб пашырыць удзел народа ў кіраванні краінай. Большасць дэпутатаў Нацыянальнага кангрэса былі прыхільнікамі ван дэр Ноота.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Актыўнай кансерватыўнай палітычнай сілай выступіла духавенства. Яно сабрала 400 тыс. подпісаў веруючых пад петыцыяй з патрабаваннем аднавіць старыя вольнасці і сістэму кіравання. 16 сакавіка 1790 г. у царквах з'явілася пракламацыя, якая зклікала вернікаў сабрацца на цэнтральнай плошчы Бруселя каб абараніць рэлігію, канстытуцыю і свабоду ад "інтрыганаў патрыятычнага клуба". У горадзе пачаліся пагромы дэмакратаў. Прыхільнікі Вонка збеглі ў Намюр, дзе стаялі рэвалюцыйныя войскі пад камандаваннем ван дэр Мерша. Але і тут прадстаўнікі дэмакратычнай партыі не змаглі ўтрымацца і вымушаны былі ўцякаць у Францыю.

20 лютага 1790 г. памёр Іосіф II. На трон узышоў Леапольд II. Ён адразу паабяцаў бельгійцам поўную амністыю і аднаўленне ранейшых вольнасцей. Пасаду генерал-губернатара павінен быў займаць прадстаўнік правячай дынастыі. Усе астатнія пасады – самі бельгійцы. Партыя ван дэр Ноота адмовілася пайсці на перагаворы. Партыя Вонка схілялася да перагавораў каб дабіцца больш дэмакратычных рэформ.

Тым часам міжнародныя ўмовы рэвалюцыі пагоршыліся. На канферэнцыі, якая праходзіла ў Рейхенбаху ў ліпені 1790 г. Англія, Галандыя і Прусія вырашылі падтрымаць Леапольда II у барацьбе з Брабанцкай рэвалюцыяй. Разлічваць на замежную дапамогу бельгійцам больш не даводзілася. 30-тысячная аўстрыйская армія ўступіла ў Бельгію. Яна амаль не сустрэла супраціўлення. Рэвалюцыя была падаўлена.

Улада аўстрыйцаў аднавілася. Пры гэтым Леапольд II стрымаў свае абяцанні. Была адноўлена сістэма кіравання часоў Марыі-Тэрэзіі. Прыхільнікі Вонка змаглі вярнуцца на радзіму.

3. Французская рэвалюцыя канца 18 ст. аказала вялікі ўплыў на працэс далейшай мадэрнізацыі Рэспублікі Злучаных Правінцый. Яе аранжысцкі ўрад заняў негатыўную пазіцыю ў дачыненні да рэвалюцыйных падзей у Францыі. У грамадстве былі значныя сімпатыі на карысць рэвалюцыйнай Францыі. 1 лютага 1793 г. Канвент Францыі абвясціў вайну Нідэрландам як саюзніку Англіі. Французам супрацьстаяла армія статхаўдэра, якая складалася амаль выключна з наёмнікаў. У той жа час у краіне дзейнічалі прафранцузскія падпольныя групы. У першай палове студзеня 1795 г. французская армія ўсталявала поўны кантроль над Нідэрландамі. Статхаўдэр Вільгельм V з сям'ёй перабраўся ў Англію. Разам з французскай арміяй у Нідэрланды прыйшоў Батаўскі легіён, які складаўся з эмігрантаў–патрыётаў. Насельніцтва ў большасці станоўча ставілася да французскай арміі.

26 студзеня 1795 г. патрыёты абвясцілі Батаўскую рэспубліку (племя батаў у антычнасці жыло на тэрыторыі Нідэрландаў). Урад рэспублікі не дэманстраваў крайнасцей рэвалюцыйнай барацьбы як у Францыі. Аранжысты не падвяргаліся жорсткаму пераследу. Шэраг з іх увайшлі ў рэвалюцыйны ўрад. Аднавілі работу правінцыйныя і Генеральныя штаты. Апошнія ліквідавалі ўладу статхаўдэра і абвясцілі суверэнітэт народа. 16 мая 1795 г. Батаўская рэспубліка і Французская рэспубліка падпісалі Гаагскі дагавор. Ён гарантаваў незалежнасць Батаўскай рэспублікі, але абавязваў яе ўдзельнічаць у войнах, якія вяла Францыя. Для Батавіі былі невыгадныя і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

наступныя палажэнні дагавора: яна страчвала тэрыторыі Маастрыхта, Зеландскай Фландрыі, Венло; павінна была выплочваць Францыі кантрыбуцыю ў 100 млн гульдэнаў; утрымліваць на свой кошт 25-тысячны французскі акупацыйны корпус.

Вясной 1796 г. быў скліканы Нацыянальны сход, задача якога заключалася ў прыняцці новай канстытуцыі. У ім большасць дэпутатаў належала да гандлёвай буржуазіі. Яны з'яўляліся праціўнікамі цэнтралізацыі краіны і выступалі супраць уключэння адпаведных палажэнняў у канстытуцыю. Але пад ціскам французскага пасла быў падрыхтаваны праект канстытуцыі, які прадугледжваў цэнтралізацыю. Новая канстытуцыя прадугледжвала дзяленне краіны на дэпартаменты, якія самастойна распараджаліся сваімі фінансамі. Вышэйшым органам улады павінен быў стаць Нацыянальны сход, які выбіраўся ўсімі мужчынамі, якія дасягнулі 20 гадоў. Стваралася цэнтралізаваная сістэма выканаўчай улады. Але праект канстытуцыі быў адхілены на плебісцыце, які адбыўся ў жніўні 1797 г.

Пасля правала плебісцыта па канстытуцыі Батаўская рэспубліка апынулася ў становішчы палітычнага хаоса. Федэралісты і ўнітарысты вялі паміж сабой вострую палітычную барацьбу. У студзені 1798 г. быў абраны другі Нацыянальны сход. Большасць у ім атрымалі ўнітарысты. 17 студзеня 1798 г. была прынята канстытуцыя. Выканаўчая ўлада належала Дырэкторыі з 5 членаў, заканадаўчая – двухпалатнаму парламенту. Краіна была цэнтралізавана. Было ўсталявана адзінства закнадаўства, судовай і фінансавай сістэм. Усе рэлігійныя канфесіі атрымалі роўныя правы. У выніку непратэстанты (40 % насельніцтва краіны) атрымалі магчымасць удзельнічаць у палітычным жыцці.

Прыняцце канстытуцыі не прывяло да аслаблення палітычнай напружанасці. Урад пачаў ажыццяўляць арышты дзеячаў апазіцыі. У чэрвені 1798 г. у Гаагу вярнуўся Герман Віллем Дандэс. Ён быў адным з актыўных удзельнікаў руху патрыётаў. Затым служыў у французскай арміі, меў чын генерала. Дандэс арыштаваў членаў Дырэкторыі, склікаў новы Народны сход і сфарміраваў Часовую Дырэкторыю. Аднак улада Дандэса аказалася непрацяглай. У 1799 г. ён быў абвінавачаны ў неўдалым кіраванні арміяй Батаўскай рэспублікі, калі англа-рускія войскі высадзіліся на яе ўзбярэжжа, а флот перайшоў на бок аранжыстаў, і вымушаны быў пайсці ў адстаўку.

У 1801 годзе ў Батаўскай рэспубліцы быў сфарміраваны новы ўрад – Дзяржаўнае рэгенства, – які праіснаваў да 1805 г. Сярод 12 яго членаў былі і аранжысты, і патрыёты. Заканадаўчая ўлада ў выглядзе 35 дэпутатаў была слабой: яны маглі толькі ці прымаць, ці адхіляць прапанаваныя ўрадам законапраекты. У 1805 г. была прынята апошняя рэспубліканская канстытуцыя. Вялікі пенсіянарый Рутгер Ян Схімелпеннік (Ян Ражэр Шымелпеннік) па ёй быў надзелены неабмежаванай уладай. Ён скараціў правы асобных правінцый і яшчэ больш цэнтралізаваў сістэму кіравання.

У чэрвені 1806 г. Напалеон І усталяваў Нідэрландскае каралеўства і пасадзіў на трон свайго брата Луі (Людовік) Банапарта. Новы кароль спрабаваў праводзіць палітыку, якая б адпавядала інтарэсам яго падданых.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ён даволі спакойна ставіўся да парушэння галандцамі кантынентальнай блакады. Не выконваў забарону Напалеона I адносна ўвозу з тэрыторыі Галандыі ў Францыю каланіяльных тавараў, якія дастаўляліся амерыканскімі караблямі. Пры падтрымцы Людовіка быў адкрыты Каралеўскі інстытут навукі, літаратуры і мастацтва. Быў створаны каралеўскі музей.

10 ліпеня 1810 г. Нідэрланды ўвайшлі ў склад Французскай імперыі як 7 дэпартаментаў. На іх распаўсюдзіліся французскія законы і французская сістэма дзяржаўнага кіравання. Нідэрланды пасылалі ў Парыж 6 сенатараў, 6 дэпутатаў Дзяржаўнага савета, 25 дэпутатаў у Заканадаўчы корпус. Ты самым у краіне ўмацоўвалася сістэма прадстаўнічага праўлення. Французскае заканадаўства гарантавала прававую і палітычную роўнасць грамадзян. Былі адменены гандлёвыя прывілеі, уведзена адзіная падатковая сістэма. Яшчэ ў час Батаўскай рэспублікі была нацыяналізавана Ост-Індская кампанія. Уключэнне Нідэрландаў у склад Францыі прывяло да таго, што французскія ўлады сталі жорстка патрабаваць выканання нідэрландскімі дэпартаментамі кантынентальнай блакады. Эканоміку падрывалі і вялікія затраты (як вынік – высокія падаткі) на ўдзел у Напалеонаўскіх войнах. Гэта вяло да застою ў прамысловасці, гандлі, сельскай гаспадарцы, скарачэння даходаў.

15 лістапада 1813 г. народнае паўстанне звергла французскую ўладу. У краіну ўступілі англійскія і прусскія войскі. Да ўлады вярталася Аранская дынастыя.

З пачаткам рэвалюцыйных войнаў Бельгія адразу стала тэатрам ваенных дзеянняў. У канцы 1792 – пачатку 1793 г. французская армія заняла бельгійскія правінцыі Але вымушана была іх пакінуць вясной 1793 г. У 1794 г. французская армія вяла паспяховае наступленне ў Бельгіі. 26 чэрвеня яна атрымала рашаючую перамогу над аўстрыйцамі ў бітве пры Флерусе. Пасля гэтага бельгійскія правінцыі ў 1794 г. былі ўключаны ў склад Францыі. Бельгія была падзелена на 9 дэпартаментаў. Тут было ўведзена французскае заканадаўства і французская сістэма кіравання. Усе змены дзяржаўнага ладу Францыі ў адпаведнасці з канстытуцыямі 1795 г., 1799 г., затым – дзяржаўны лад імперыі, пераносіліся на бельгійскія дэпартаменты. Рэшткі феадалізму былі поўнасцю ліквідаваны. Бельгійскія тавары атрымалі свабодны выхад на французскі рынак. Французы адмянілі забарону судаходства па Шэльдзе, што важна было для развіцця гандлю. Але былі і перашкоды для эканамічнага развіцця Бельгіі: неабходнасць удзельнічаць з 1806 г. у кантынентальнай блакадзе, несці вялікія ваенныя выдаткі. У 1814 г. войскі шостай антыфранцузскай кааліцыі вызвалілі тэрыторую Бельгіі з-пад улады Францыі.

У перыяд Батаўскай рэспублікі і Галандскага каралеўства, знаходжання Бельгіі і Нідэрландаў у складзе Францыі мадэрнізацыйныя працэсы ў Паўночных і Паўднёвых Нідэрландах паскорыліся. У палітычнай сферы яны праявіліся ў замацаванні традыцый канстытуцыйнага прадстаўнічага праўлення, прынцыпу народнага суверэнітэту. Пашырыўся корпус выбаршчыкаў. Была знішчана саслоўная структура грамадства, усталявана палітычная і прававая роўнасць паміж людзьмі. Французскае заканадаўства

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стварала свабоду прадпрымальніцкай дзейнасці, гарантавала недатыкальнасць уласнасці, што было важна для развіцця капіталізму.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ